**П. Ф. Сацук**

# ПАЛІТЫЧНАЯ БІЯГРАФІЯ РАМАНА СКІРМУНТА

Праблема станаўлення беларускай дзяржаўнасці з'яўляецца адной з найбольш актуальных у сучаснай айчыннай гістарычнай навуцы. У гэтым кантэксце асаблівы інтарэс уяўляюць палітычныя погляды Рамана Скірмунта і іх магчымая эвалюцыя ў кантэксце падзей пачатку XX стагоддзя звязаных з станаўленнем нацыянальнай дзяржаўнасці,. Дадзеная праблема ўяўляецца актуальнай таму, што на маю думку постаць Рамана Скірмунта адлюстроўвае супярэчлівасці разумення сутнасці беларускай ідэі, а таксама адну з асноўных праблем беларускай дзяржаўнасці – выбару шляху цывілізацыйнага развіцця.

Раман Скірмунт – адзін з ідыёлагаў краёвай канцэпцыі, палітык некалькі дзяржаў. Ператварэнне прадпрымальніка ў палітыка было выклікана складанай нацыянальна-культурнай і палітычнай сітуацыяй і ўсведамленнем Раманам Скірмунтам новай гістарычнай ролі ніжэйшых колаў грамадства, што патрабавала выпрацоўкі новай палітычнай праграмы дзейнасці польска-

моўнай шляхты. Відавочна, што пры распрацоўцы канцэпцыі Р. Скірмунт звяртаўся да гістарычнай традыцыі, але было няшмат прыхільнікаў яе аднаўлення, фактычна імі заставаліся толькі некаторыя беларускія дзеячы. Да беларускага руху Скірмунт далучыўся ў 1916, а потым узначаліў у час кардынальных пертварэнняў. Ён мкнуўся да кансалідацыі ўсіх наяўных сіл і спачатку да прызнання Беларусі як аўтаноміі ў складзе Расіі ў часы Часовага ўраду, а потым як незалежнай дзяржавы. Шэраг праблем – адзінства беларускага руху, адносін нацыянальнага і сацыяльнага, папулярнасці беларускай ідэі, рэальнай гатоўнасці прызнання самавызначэння Беларусі з боку міжнароднай супольнасці, праблема хуткай радыкалізацыі жыцця – прывядзе да трагедыі не толькі Скірмунта, які не зможа ўпісацца ў радыкальныя рамкі і будзе вымушаны адысьці спачатку ад публічнай дзейнасці, а потым і ад беларускага руху. Раман Скірмунт на некаторы час адыходзіць ад палітыкі. Чытаючы яго публіцыстыку, можна канстантаваць пра пэўныя перамены свядомасці ў польскім кірунку, з Польшай ён звязваў спадзевы на нармалізацыю жыцця. Наогул, пытанне ідэнтычнасці – адно з ключавых. І постаць Скірмунта паказвае, што ён меў хутчэй мульціідэтнычнасць і яго складана аднесці адназначна да адной этнанацыянальнай.

Восенню 1939 г. Р. Скірмунта заб'юць людзі з яго маёнтка з-за ўласных інтарэсаў. І трагізм не толькі ў тым, што гэта забойства, але і ў тым, што гэта рабілася рукамі саміх беларусаў і сялян, за правы якіх выступаў Скірмунт. Раман Скірмунт быў унікальным палітыкам для свайго часу, але яго ўяўленні аб будучыні Беларусі не супадалі з вірам падзей першай паловы ХХ ст.